Такім чынам, на факультэце праведзена поўная работа па ўкараненні рэйтынгавай сістэмы ацэнкі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў для павышэння якасці адукацыйнага працэсу з улікам спецыфікі вучэбных дысцыплін. Рэйтынгавая сістэма можа стаць эфектыўным інструментам у паляпшэнні якасці калектыўна-выканальніцкай дзейнасці на факультэце (аркестравы, харавы класы; класы інструментальных і вакальных ансамбляў). Трэба адзначыць, што рэйтынгавая сістэма прадугледжвае вызначэнне ўдзельнай вагі кожнага віду студэнцкай працы, яе выкарыстанне дапамагае наладзіць супрацоўніцтва і гарманізаваць адносіны паміж выкладчыкам і студэнтам. Практыка выяўляе як моцныя, так і слабыя месцы рэйтынгавай сістэмы, што дазваляе яе ўдасканальваць.

1. *Лобанов, А.П.* Управляемая самостоятельная работа студентов в контексте инновационных технологий / А.П. Лобанов, Н.В. Дроздова. – Мн.: РИВШ, 2005. – 107 с.

2. *Сергеенкова, В.В.* Управляемая самостоятельная работа студентов. Модульно-рейтинговая и рейтинговая системы / В.В. Сергеенкова. — Мн.: РИВШ, 2004. — 132 с.

**Л.Ф. Голікава,** *дацэнт*

## АРГАНІЗАЦЫЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ
(кафедра тэатральнай творчасці)

У пачатку XXI ст. перад вышэйшай школай, як ніколі раней, паўстае пытанне выпрацоўкі аптымальных патрабаванняў да ўзроўню падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. У творчых ВНУ, у тым ліку і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў, у сувязі з гэтым актуальнай і перспектыўнай бачыцца сучасная канцэпцыя вышэйшай адукацыі, якая арыентуе студэнта на канчатковы вынік у авалоданні прафесіяй, у чым вялікую ролю адыгрывае самастойная работа кожнага навучэнца, а тым больш – будучага рэжысёра, высокакваліфікаванага спецыяліста, які падрыхтаваны як да творчай, педагагічнай, так і да навукова-творчай



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і нават навукова-даследчай дзейнасці. У гэтым галоўная мэта сучаснага навучання.

Як вядома, рэжысёр у першую чаргу – гэта асоба, якой уласцівы "*творчая самастойнасць* (курсіў наш. – *Л.Г.*), арганізацыйныя здольнасці, педагагічнае майстэрства... адным словам, гэта павінен быць спецыяліст шырокіх творчых магчымасцей, які можа лёгка адаптавацца да любых абставінаў" [1, с. 38]. Падобнае неаднаразова адзначалі многія выдатныя дзеячы тэатра (Б. Пакроўскі, Г. Таўстаногаў, В. Меерхольд, С. Гарчакоў, Ю.Завадскі і інш). "Наша ўсё" ў мастацтве рэжысуры К.С. Станіслаўскі неаднаразова падкрэсліваў асобую значнасць менавіта *самастойнай* работы пры авалоданні прафесіяй будучым рэжысёрам, асобай творчай: ён "павінен паклапаціцца аб сваёй адукацыі і выхаванні", "энергічна прыступіць да *самаадукацыі і самаўдасканалення* (курсіў наш. – *Л.Г.*). Гэтая работа бясконцая, бязмежная, адвечная, паколькі новыя веды адкрываюць невядомыя недахопы" [2, с. 524, 525].

Самастойная работа студэнтаў – не самамэта, а жыццёва неабходная ўмова выхавання творчай індывідуальнасці, так званага "штучнага прадукту". Яе арганізацыя мае свае асаблівасці.

Па-першае, яна павінна ўлічваць, для каго прызначана самастойная работа, адметнасць вучэбнай аўдыторыі, будучая прафесія навучэнцаў якой – рэжысура. Яна патрабуе глыбокіх ведаў пра мастацтва тэатра ва ўсіх яго праявах і жанравых разнавіднасцях, фарміравання ўстойлівага інтарэсу да праблем сучаснай рэжысуры, авалодання прафесійнымі навыкамі ў абранай сферы дзейнасці.

Па-другое, улічваць, дзеля чаго арганізоўваецца гэты від вучэбнай работы, – галоўную *мэту* падрыхтоўкі будучых рэжысёраў. Яна заключаецца ў тым, што неабходна не толькі даць студэнтам тэарэтычныя і практычныя веды, але і здолець захаваць і развіць творчую індывідуальнасць кожнага з іх, гэта значыць – не нівеліраваць, не рыхтаваць прафесійна аднолькавымі. На малодшых курсах самастойная работа студэнтаў садзейнічае пашырэнню і замацаванню прафесійных ведаў і ўменняў, на старшых курсах абумоўлівае развіццё іх творчага патэнцыялу.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

І, нарэшце, трэцяе: якім чынам, пры выкананні якіх абавязковых умоў адбываецца арганізацыя самастойнай работы студэнтаў. Такімі ўмовамі з'яўляюцца яе сістэмнасць і этапнасць.

На першым этапе – падрыхтоўчым – ствараецца база для сістэматычнага вядзення самастойнай работы студэнтамі і кантролю за ёй з боку педагога (складаюцца рабочыя праграмы, дзе ўказваюцца тэмы для самастойнай працы, рыхтуюцца вучэбна-метадычныя матэрыялы, абавязкова праводзіцца дыягностыка ўзроўню падрыхтаванасці кожнага са студэнтаў і г. д.).

На другім этапе – арганізацыйным – педагог сустракаецца са студэнтамі, вызначае мэты і задачы самастойнай работы, парадак, тэрміны і формы прагляду педагогам прамежкавых вынікаў, праводзіць, калі неабходна, індывідуальныя і групавыя кансультацыі і інш.

Трэці этап – дзейсны. Менавіта на гэтым этапе ажыццяўляюцца самакантроль і самакарэкцыя атрыманых студэнтамі ведаў.

Чацвёрты этап – завяршаючы, кантрольна-ацэначны. Яго вынікамі на малодшых курсах могуць быць індывідуальны паказ самастойна падрыхтаванага студэнтам твора (твораў), эцюда, сцэнкі, рэферат на праблемную тэму (напрыклад, па псіхалогіі мастацкай / рэжысёрскай творчасці і інш.), даклад, артыкул, анатацыі, эсэ, рэцэнзіі на прагледжаны спектакль, прачытаную кнігу, стварэнне наглядных дапаможнікаў; на старшых курсах – курсавая работа, дыпломная работа, спектакль, канцэртны нумар (нумары) і іншае ў залежнасці ад вывучаемай дысцыпліны. І на гэтым этапе адбываецца непасрэдны кантроль і ацэнка самастойнай работы студэнтаў з боку педагога.

Формы самастойнай работы, што выкарыстоўваюцца на кафедры тэатральнай творчасці, можна ўмоўна падзяліць на *тэарэтычныя* (адпаведна лекцыйным курсам і семінарскім заняткам, якіх няшмат) і *практычныя* (адпаведна практычным, семінарскім, дробнагрупавым і індывідуальным заняткам).

У сваю чаргу, існуюць два віды самастойных заняткаў: *аўдыторныя* і *пазааўдыторныя*.

Да *аўдыторных* відаў можна аднесці (па частаце і эфектыўнасці выкарыстання): падрыхтоўку да індывідуальных і тэарэтычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

заняткаў па спецдысцыплінах (рэжысура, акцёрскае майстэрства, сцэнічная мова і інш.) – штотыднёва; самастойнае вывучэнне студэнтамі мастацкіх тэкстаў, падрыхтоўку эцюдаў, трэнінгавых практыкаванняў па рэжысуры, акцёрскім майстэрстве, сцэнічнай мове; напісанне творчых работ па тэатральнай крытыцы; падрыхтоўку да рубежнага (штомесячнага) і міжсесіённага (штосеместравага) кантролю, кантрольных заняткаў (2–3 разы ў семестр), да залікаў і экзаменаў па спецдысцыплінах; самастойнае вывучэнне спецыяльнай літаратуры і яе рэферыраванне (па меры атрымання ведаў, вывучэння тэарэтычных курсаў); правядзенне вучэбнай (азнаямленчай), вучэбна-вытворчай, педагагічнай і пераддыпломнай практыкі (штогадова).

Да *пазаадытoрных* відаў можна аднесці: падрыхтоўку спектакляў, канцэртаў і іншых мерапрыемстваў (кафедральных, факультэцкіх, універсітэцкіх) як "унутры" навучальнай установы, так і за яе межамі, удзел студэнтаў у гарадскіх, рэспубліканскіх, міжнародных конкурсах, фестывалях, у тым ліку і ў іншых краінах свету; работу (студэнтаў) у якасці вядучых розных мастацкіх праграм і інш.; выступленне з дакладамі на універсітэцкіх, міжвузаўскіх, рэспубліканскіх і міжнародных канферэнцыях, напісанне тэзісаў дакладаў, артыкулаў, рэцэнзій, дэпаніраванне і публікацыю іх ва універсітэцкім, і не толькі, друку (ва універсітэцкіх і рэспубліканскіх зборніках); штогадовы ўдзел навуковых работ студэнтаў кафедры тэатральнай творчасці ў рэспубліканскім конкурсе.

Усе пералічаныя вышэй віды і формы самастойнай работы забяспечваюць усебаковае фарміраванне прафесійнай самасвядомасці студэнтаў, без якой нельга стаць ні рэжысёрам, ні акцёрам, ні драматургам.

*Формы кантролю* абумоўліваюць наяўнасць *аўдыторнага* і *пазааўдыторнага* кантролю. *Аўдыторны* – гэта кантроль за падрыхтоўкай студэнтаў да індывідуальных заняткаў па спецдысцыплінах, да семінараў, практычных заняткаў; кантрольныя заняткі (2–3 разы ў семестр); кантрольна-праверачныя тэставыя заданні (выкарыстоўваюцца па курсу вакалу); міжсесіённы кантроль (на працягу семестра); рубежны кантроль, залікі, экзамены; абарона розных відаў практыкі. *Пазааўдыторны* кантроль – гэта ацэнка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагогам удзелу студэнтаў у спектаклях, канцэртах, конкурсах, фестывалях, мастацкіх праграмах і інш. як ва універсітэце, так і па-за ім; у падрыхтоўцы ўрыўкаў з курсавых (II курс) і пастаноўцы дыпломных спектакляў (V курс); у творчых паказах у рамках штогадовай навукова-творчай канферэнцыі студэнтаў, магістрантаў і аспірантаў; заахвочвання ў напісанні ўласных твораў – вершаваных, празаічных, драматычных і іх публікацыі ва універсітэцкім і рэспубліканскім друку, у зборніку "Альфабэт".

Самастойная работа абавязкова ўлічваецца пры фарміраванні на кафедры вучэбна-метадычнай дакументацыі (вучэбна-метадычных комплексаў) па розных курсах і спецдысцыплінах, якія падзяляюцца на чатыры блокі: метадычная дакументацыя па спецыяльных дысцыплінах (рэжысура, акцёрскае майстэрства, методыка выкладання спецдысцыплін і інш.); па дысцыплінах спецыялізацый (сцэнічная мова, сцэнічны рух (фехтаванне), музыка ў спектаклі, грым, тэхніка сцэны і інш.); па сумежных творчых дысцыплінах (пастаноўка танца ў спектаклі, сцэнічны танец, свецкі і сцэнічны этыкет, вакал і інш.); па тэарэтычных дысцыплінах (тэорыя і гісторыя рэжысуры, методыка работы з аматарскім тэатрам, тэатральная крытыка і інш.).

Заданні па тэмах самастойнай работы, якія ўключаны ў вучэбна-метадычныя комплексы, носяць *творчы* характар: індывідуальныя заданні па рэжысуры, акцёрскім майстэрстве, сцэнічнай мове, сцэнічным руху і інш. (напрыклад, самастойная падрыхтоўка ўрыўкаў са спектакляў, сцэнічных паказаў, канцэртных нумароў і г. д.); падбор вучэбнага рэпертуару (выбар п'есы), музычнага суправаджэння да спектакляў, канцэртаў; самастойнае правядзенне рэпетыцый (па заданні педагога); самастойная распрацоўка сцэнарыяў, канцэртных паказаў і інш. Заданні могуць мець і *даследчы* характар: курсавыя работы па рэжысуры, асновах драматургічнага майстэрства, семінары-практыкумы па драматургіі, тэатральнай крытыцы; дыпломныя работы па спецыяльнасці; навуковыя распрацоўкі студэнтаў (даклады, публікацыі тэзісаў і артыкулаў у зборніках навуковых работ студэнтаў, удзел асобных студэнтаў у навукова-даследчай рабоце кафедры – комплекснай тэме "Тэатральнае мастацтва Беларусі: гістарычны, тэарэтычны і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

педагагічны аспекты”); выкарыстанне навуковых распрацовак студэнтаў у навучальным працэсе.

У заданнях для самастойнай работы адлюстроўваюцца міжпрадметныя сувязі: усе спецыяльныя дысцыпліны і дысцыпліны спецыялізацый узаемазвязаны (напрыклад, пры выкананні заданняў па рэжысуры студэнты дэманструюць уменні і навыкі, набытыя пры вывучэнні акцёрскага майстэрства, сцэнічнай мовы, сцэнічнага руху, танца, музыкі ў спектаклі, вакалу, грыму і г. д.).

Заданні маюць індывідуалізаваны характар (у залежнасці ад ступені падрыхтоўкі кожнага студэнта), яны дыферэнцыраваны па ступені складанасці (ад засваення калектыўных трэнінгавых формаў на пачатковых занятках на малодшых курсах да авалодання – на старшых курсах – правіламі індывідуальнага публічнага выступлення).

Акрамя таго, заданні разлічаны на работу студэнтаў у групах, што абумоўлівае найбольш якасны *самакантроль* і спрыяе засваенню вучэбнага матэрыялу непасрэдна ў працэсе творчай работы (напрыклад, пры пастаноўцы невялікага спектакля для іх удзельнікаў распрацоўваюцца метады работы над п’есай, спектаклем, з акцёрам, акцёрскай групай і г. д.).

Такім чынам, самастойная работа дазваляе навучэнцу паспрабаваць сябе, па-першае, у якасці сатворцы педагога, а па-другое – адчуць сябе сапраўднай творчай асобай, што ў рэшце рэшт садзейнічае выпрацоўцы ў кожнага “звышасэнсаванай арганічнай творчасці” [2, с. 278], бо “спыненне ў працы можа выклікаць... шаблон, гэта значыць рамяство”, у той час як няспынная мастацкая дзейнасць, творчасць ёсць “стваральны працэс духоўнай і фізічнай прыроды” [2, с. 439, 441].

---

1. *Сучасная* беларуская рэжысура. Пошукі мастацкай адметнасці ў кантэксце традыцый еўрапейскага тэатра: зб. артыкулаў. – Мн.: Арты-Фэкс, 1998. – 314 с.

2. *Станиславский, К. С.* Мое гражданское служение России. Воспоминания. Статьи. Очерки. Речи. Беседы: из записных книжек / К.С. Станиславский; сост., вступ. ст. и коммент. М.Н. *Любомудрова.* – М.: Правда, 1990. – 656 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ